*В.В. Бурсевіч*

## Талерантнасць = абыякавасць?

Дастаткова часта даводзіцца чытаць альбо чуць меркаванні на конт адметных рысаў беларускага менталітэту, сярод якіх, як правіла, адзначаецца талерантнасць альбо цярпімасць у розных яе праявах – рэлігійная, нацыянальная, расавая. Асабіста я не магу пагадзіцца з падобнага кшталту выказваннямі. Па-першае – яны вынік не столькі аналізу рэальнага побыту і жыццядзейнасці насельніцтва, колькі працэсу стэрэатыпізацыі самаўяўлення беларусаў. Па-другое дадзеную міфічную характарыстыку можна з лёгкасцю аспрэчыць, успоўнішы хаця б знакамітыя байкі пра прадстаўнікоў розных нацый (асаблівай “папулярнасцю” карыстаюцца яўрэі і кітайцы). Па-трэцяе таму, што падчас такім прыгожым і шмат у чым штучным канструктам спрабуюць прыкрыць, на мой погляд, рысы, якія ў дастаткова поўнай меры дэтэрмінуць паўсядзённыя практыкі нашага люду, гэта – агульная млявасць і абыякавасць да таго, што адбываецца побач, нейкая ўнатраная пустэча, духоўная інэртнасць, пасіўнасць, адсутнасць унатранай перакананасці і жыццёвага крэда, што праяўляецца на ўсіх узроўнях асабістага існавання.

Наўрад ці можна экстрапаліраваць на ўсю студэнцкую суполку вынікі праведзенага мной невялічкага сацыялагічнага даследвання (выбарка ахапіла 30 чалавек), але тое, што яны мажліва не поўнасцю, але хаця б часткова падцвярджаюць вышэйпазначаны тэзіс, сведчыць аб тым, што ёсць над чым задумацца як выкладчыкам, так і нам, студэнтам. За фактамі хадзіць далёка не трэба, узяць хаця б размеракаванне адказаў на адно з пытанняў, калі толькі адзін з дзесяці студэнтаў (калі браць на веру шчырасць студэнцкіх адказаў) адзначае, што ведае поўныя імёны ўсіх выкладчыкаў. Такое становішча справаў наўрад ці можна патлумачыць вялізарнай колькасцю гэтых самых выкладчыкаў, складанасцю імёнаў ці павальнай студэнцкай эпідэміяй амнезіі, хутчэй за ўсё нам на вялікі рахунак проста ўсё роўна.

Першае, што кідаецца ў вочы пры аналізе сітуацыі – гэта згуба студэнтам асабістай ініцыятывы, якая суправаджаецца акрамя таго станам татальнай згоды з тым, што адбываецца навокал – мы, студэнты, нічога не бачым вакол сябе і самае страшнае не хочам нічога бачыць. І адбываецца гэта ў першую чаргу па віне саміх студэнтаў, якія настолькі прызвычаіліся да цудоўнага слова “сістэма”, віноватае ва ўсіх нашых непрыемнасцях ці як нейкая чароўная палачка здольнае ў адзін момант змяніць у лепшы бок усё нашае існаванне, што нават забыліся на тое, з каго ж усё ж такі гэтая мысленчая абстракцыя складаецца ў рэальным жыцці. Так, на пытанне аб узнікненні арганізацыйных праблемаў падчас навучання ўсе як адзін пацвердзілі, што такія праблемы мелі месца быць, толькі вось пры адказе на далейшае пытанне аб спробах такія праблемы вырашыць, студэнцкі спрыт чамусьці рэзка зніжаецца – яны гатовы абвінавачваць усіх, але толькі не сябе: так, сярод “казлоў адпушчэння” у студэнцкім спісе на першым месцы знаходзяцца работнікі дэканата, на другім – гэтыя вечныя ўсюдыпранікальныя абстракцыі – “сістэма адукацыі” і “ўся студэнцкая група” (і адкуль толькі ў студэнтаў бярэцца столькі “калектывізму”?). Такі знайшлася з трыццаці чалавек адна асоба, што сціпла разам з першымі трыма варыянтамі пазначыла ў спісе – “мая асабістая бяздзейнасць”. Студэнт настолькі паверыў у гэтую абстрактную здань – сістэму, што нават і не спрабуе штосьці змяніць у сваім жыцці – палова апытаных перакананна што дзеянні не прывядуць да якіх-небудзь станоўчых вынікаў, хаця тут жа адзначаюць, што ні разу не спрабавалі што-небудзь змяніць у працэсе навучання, а на вялікі рахунак (і студэнты бессарамліва ў гэтым прызнаюцца) нам проста ў ляноту паварухнуцца, каб хоць штосьці змяніць ва ўніверсітэце. Мы незадаволены тым што ёсць, але не ведаем як павінна быць, адзінае на што мы яшчэ здатныя – так гэта праявіць сваю незадаволенасць па сродкам “абмеркавання выкладчыка ці прадмета з сябрамі і знаёмымі” (80% апытаных).

Па-другое, сучасны студэнт не ўмее (альбо не хоча?) праяўляць станоўчыя адносіны, сваё распалажэнне да выкладчыка і яго прадмета – ён

выражае гэта максімум сваёй прысутнасцю на занятках (адзначылі дзевяць з дзесяці апытаных). Аднак, хадзіць на заняткі – гэта, скажам так, не столькі права, колькі прамы абавязак студэнта, і прымаючы ва ўвагу той факт, што падчас на лекцыях на старэйшых курсах з групы ў 35-40 чалавек прысутнічае максімум дзесяць, можна з упэўненасцю сцявярджаць, што ідэальная мадэль паводзінаў і рэчаіснасць яўна кантрастуюць паміж сабой: як правіла, студэнт не можа ўважыць выкладчыка нават праз простую прысутнасць, бо, на мой суб'ектыўны погляд, з усёй разнастайнасці прадметаў, якія выкладаюцца на факультэце, павінен быць хаця б адзін, на які сапраўды хацелася б хадзіць усёй групе. Мала хто са студэнтаў напрамую выказвае сваю ўдзячнасць за цікава праведзеную лекцыю ці семінар, і напэўна не таму, што такіх лекцыяў ці семінараў не бывае ў сценах універсітэта, а таму, што па-першае адсутнічаюць традыцыі (хто як не мы ствараем і падтрымліваем іх!), а па-другое студэнты, як правіла, застаюцца глухімі, да таго, што адбываецца ва аўдыторыі, а выкладчыку, напэўна, часам вельмі хочацца быць пачутым.

Карацей кажучы, студэнты скардзяцца, што ў іх забіраюць ініцыятыву, душаць, а на мой погляд, сапраўдную ініцыятыву і жаданне што-небудзь здзяйсняць нельга задушыць, іншая справа, калі яе проста няма. Адсюль атрымліваецца нейкае замкнёнае кола ў адносінах, і каб разамкнуць яго, не трэба ківаць на сістэму адукацыі, работнікаў дэканата, старастаст, нейкага нерэальнага суб'екта – групу, проста трэба пачаць з сябе, узяць на свае плечы адказнасць і свядома ставіцца да таго, што адбываецца вакол.